Тарас Касмінка

# КАЗКА ПРА БОГА СВЯТОГА І ДУДАРА УДАЛОГА

Тарас Касмінка

# КАЗКА ПРА БОГА СВЯТОГА І ДУДАРА УДАЛОГА

(Паводле казкі Вацлава Ластоўскага "Дудар")

Менск, 2000

© Тарас Касмінка

## *Светлай памяці Міколы Ермаловіча*

Ойча наш, існы на нябёсах!
Да свяціцца імя тваё;
Да надыйдзе царства тваё;
Да будзе воля твая
І на зямлі, як на небе;
Хлеб наш надзённы
Дай нам на гэты дзень;
І даруй нам даўгі нашы,
Як мы даруем
Даўжнікам нашым;
І не ўводзь нас у спакусу,
Але барані нас ад нячыстага;
Бо тваё ёсць царства,
І сіла, і слава на вякі.
Амінь!

*«У лукоморья дуб зелёный...»*

**Аляксандр Пушкін.**

*«Лукоморья больше нет...»*

**Уладзімір Высоцкі.**

Можа, праўда; можа, сон;
Ў сінім небе з даўніх дзён
Ясны месячык пяе,
Быццам неяк – па вясне –
Ўзяў-памёр адзін мужык...
Ўсё сяло сышло на крык:
Бабы сталі галасіць;
Мужыкі – тытунь курыць.

Слёзы капалі з вачэй
Нават у малых дзяцей;
Што казаць тут пра старых:
Мілых, любых, дарагіх?!
Слёзы капалі з вачэй;
І не толькі у людзей:
Ля крынічанькі вярба –
З твару – дзеванька сама! –
Ціха скінула убор
І засохла аж да зор;
А пад раніцу зусім
Не пакінула слязы:
Толькі попелам дарог
Чырванеў яе парог;
Ды счарнеў трухлявы пень
За адзін набожны дзень...

Хоць пражыў мужык сто год,
Зведаў, што такое пот,
Голад, паншчына, астрог,

Войны не за свой куток, –
Сумавала ўсё сяло:
Кожны хлопец і дзяўчо
Пажадалі б столькі ж год
Мужыку на сотні вёрст!
Адпачыць на той зямлі,
Што Радзімай нараклі, –
Там вясёлыя лясы
Маюць спевы-галасы;
Ад крынічак да ажын
Там лунаюць нашы сны...
– Як завецца? – Беларусь:
Белы корань, белы вус...

Ну дык вось: памёр стары.
У ягоным у двары
Аб'явіўся раптам пан
Ды пачаў вучыць сялян:
«Што» і «як» рабіць-паслаць;
Хтось адважыўся сказаць,
Што няблага б да стала
Мець гарэлку, парсючка...
Пан паклікаў гандляроў,
Цесляроў ды муляроў:
«Не шкадуйце вы віна,
Ні грыбоў, ні палатна.
Дошкі будзем пілаваць;
Габляваць і майстраваць
Дамавіну – назаўжды:

Ад гвазда і да скабы;
На труне ж яго няхай
Зіхаціць зялёны гай!
Аплачу усё спаўна;
Калыханкаю труна
Будзе нашаму сябру –
Мужыку і сваяку!»
Што за дзіва? Больш таго
(Нешта пана панясло)
На труну адмерыў дуб:
«То ж – на справу; не на зруб!»
Хто ж такі нябожчык наш?
Ад чаго такі кураж?...
Як яшчэ сваіх стральцоў,
Малайцоў ды удальцоў,
Не падумаў пан пазваць, –
Каб навек ушанаваць
    Памяць – не палкоўніка,
    Былога заваёўніка;
    Нават і не святара:
    Проста – Янкі Дудара?!

Хутка тры мінулі дні;
Пахавалі, як змаглі.
І пяснярская душа
Ў неба сіняе пайшла...
Ўсё пакінула яна;
Толькі верная дуда
З-пад запазухі тырчыць,

Ціха ў вочанькі глядзіць...
«Што ж наперадзе за лёс
Напісаў Ісус Хрыстос, –
Думу думае мужык;
Так, што засвярбеў кадык! –
На чужой на старане
Хто ж павесяліць мяне,
Акрамя маёй дуды,
Мілых казак даўніны?!
Я без песні – не магу,
Не умею, не хачу!
Калі скажуць – не спяваць,
Хоць кладзіся-паміраць...
Як жа ў Рай – ды без дуды?!
Лепей – згінуць назаўжды!
Нешта будзе... Толькі сам
Я жалейку не аддам».

Вось і неба... Тут стары
Ледзь заўважыў:
па начы
Падыйшоў да Брамы ў Рай!
А яна – зачынена.
На дзвярох вісіць замок;
Толькі белы матылёк
Кружыць-лашчыцца ў начы,
І навокал – ні душы...
«Мабыць, спяць. Трывожыць – грэх!» –
Так падумаў; і прысеў

На калоду ля дзвярэй,
Не адводзячы вачэй;
І сядзіць – чакае дня...
Раптам цяжкая нуда
Ў сэрца Янкава зайшла:
«Ні кала ні двара!»

З-пад запазухі дуду
Дастае Дудар сваю;
Пішчык ёй папрабаваў,
Памаленьку заіграў:
Ціха – ўраз; пасля – ямчэй,
Быццам іграе для людзей!
Ну а там і не стрываў,
На паўголас заспяваў:

«Ой ты, родны мой край, белая былінка!
Нешта вызвалі ў Рай беднага мяне...
Ох ты, дудка-дуда, верная сцяжынка, –
Весялі ж мужыка ў гэтай старане!

...А з Высокай Гары нічога ня відна;
...А ў Высокім Двары, мабыць, ляпата[1]!
І стаю я адзін, як у полі вішня,
Бо чамусьці душа да відна прыйшла.

...А у Боскай Цішы не гукаюць долі;
...А на роднай зямлі варажба – прасцей:

---
[1] Фальклорны варыянт слова «Любата» – па-руску «Благодать».

Як хацеў, так і жыў, – да вялікай волі;
Хоць і многа цярпеў – не злюбіў людзей.

Калі быў шчэ малы, галадаў да смерці;
Паншчыну пражыў (дармавіты пот!);
Плакаўся мой куток – запяяў я песні:
Кінулі у астрог, павялі на фронт;

Біўся за чужакоў (ў целе – восем дзірак)
Ў 65-ць – дамоў!.. Божа ж мой: бяда!
Не далічыўся я трох дзяцей-радзінак:
З голадам адыйшлі два сыны, дачка;

Толькі – унукаў смех не дазволіў гору
Славіцца па карчме брагаю-віном;
І – расцвіла душа: дзякуй-дзякуй Богу!
К старасці прычакаў шчасця – поўны дом...

Толькі... узяў-памёр: надыйшла часінка.
І заву сярод зор ясную зару;
Ох ты, долька мая, доля-сірацінка,
Ды няўжо забяруць мілую дуду?!

Ой ты, родны мой край, бедны салавейка!
Захлыніся, бяда, брагаю-нудой!
На чужой старане, мілая жалейка,
Весялі ж ты мяне, покі я з табой!»

Раптам чуе ён: «Хто там?».
«Мабыць, святы Пётра сам? –
Цвёрда вырашыў пясняр.
І дае адказ: – Дудар!».

«Што ж ты горла так дзярэш! –
Кажуць. – Спяць даўно усе...»
Дык саўсім я не дзяру, –
Мовіць Янка. – Я пяю».
«Каб цябе...

А што ж прыйшоў
Гэтак позна?». «Божа ж мой! –
Кажа дзед ужо смялей. –
Нельга мне было раней:
Толькі ўвечары труну
Закапалі у зямлю...»
Дзівяцца за Брамай ў Рай:
«Як – пад вечар? Выбачай...
Ты ж павінен толькі йсці
На палове сцежанькі!».
Янка усміхнуўся ў вус:
«Я ж – дасужы: Беларус!».
Ледзь чуваць з-за Брамы ў Рай
Голас кажа: «Пачакай.
І адкуль, з якой зямлі?».
«З той, што Белай наклі!» –
Горда вымавіў стары.
«Вёску, горад мне кажы!», –
Зноў пытанне задаюць...
Янка чэша бараду:
«Хоць скажу – не знаеш ты...»
Хтось кашляе за дзвярмі:
«Я ўсё знаю! Ну, давай...»
«Ціха звалі – Вязынкай...»

«Ясна... Як тваё імя?».
«Янкам клікала сям'я...»
Зноў чуваць з-за Брамы ў Рай
Голас кажа: «Пачакай...»
Праз мінуты тры ці пяць –
Хто там будзе прымячаць?! –
Наш мужык у позні час
Атрымаў такі адказ:
«Ну то добра, Ян Дудар;
Ты, я бачу, – гаспадар!
Хутка развіднее ўжо;
Там пабачым: што-чаго...
А пакуль жа пасядзі
Каля Брамы. Ды глядзі
Надта Тут не гамані:
Ноч жа на Святым Двары!..»

Зноў чакае Янка дня;
Зноў маркотная нуда
Ў сэрца чыстае зайшла:
«Ні унукаў, ні сябра!»...
Тут і раніца зусім
У Нябёсныя Сады
Падкрадацца спакваля
Ў зіхаценні пачала...
З ранку ж, ведама, мацней
Халады бяруць людзей!
Дзед жа ў вопратцы адной
(Хоць вясною ўсё было).

Цяжка стала мужыку –
Некаму падаць руку...
З-пад запазухі дуду
Цягне зноў Дудар сваю:

«...Ў сінім небе ціхай ночкай
Зорка з зоркаю звініць[1];
Хлопец з мілай дзяўчыночкай
Пад бярозанькай стаіць.

...Шэпча зорачка-званочак
Зорцы-кветачцы сваёй:
– Хоць далёка мы, далёка,
Я заву цябе маёй.

...А яна яму ціхенька
Пацалунка шле букет:
– Мой міленькі, мой міленькі,
Ты мой ясны сокал-свет.

...А ў зямлі лісток лісточку
Тое ж самае пяе:
– Хоць галінкі нашы збочку, –
Я люблю адну цябе.

...Ў сінім небе ціхай ночкай,
Зорка з зоркаю звініць;
Хлопец з мілай дзяўчыночкай
Пачынае варажыць;

[1]И звезда с звездою говорит. – Радок М.Лермантава.

Хлопец з мілай дзяўчыночкай
Хоча сэрца заручыць...»

Калі сумна на душы,
Можа ўраз дапамагчы
Залацісты вольны спеў,
Ад якога – век ляцеў;
І не трэба выдумляць,
Штосьці лепшае шукаць,
Чымсьці песенкі дзядоў
(Так яно заўжды было).
Калі горка неяк жыць –
Ад галечы ці журбы –
Ратаваў святы народ
Мілых зорак карагод:
Казкі-песні даўніны;
А яны – спакой душы:
Водар лесу, кветак пах, –
Чараваны дзіўны птах!

Так іграў і наш Дудар:
Сам сабе і пан, і цар;
Толькі ўжо пачаў крыху
Лашчыць ён сваю дуду:
Ведама,
каб жа было
За дзвярыма не чутно...
Ажно!
Зірк на частакол:

«Божа ж мой! Які анёл! –
Янка ў акружэнні зор
Ледзьве зноўку не памёр! –
Вунь – адна галоўка, дзве!..
Ах! Анёлчыкі мае!
У кашульках белых ўсе,
Крылкі светлыя ў спіне;
Ўсе маленькія, нібы
Дзеткі мілыя з зямлі!».

Тут пясьнярская душа
Васілёчкам расцвіла:
Гукі ластаўкай ляцяць,
Зоркай-знічкай зіхацяць;
Быццам вязынскі чабор
Завітаў у Светлы Двор,
І салодзенькі нектар
Ахіліў Нябёсны Твар:

«Ой, краю, мой краю!
Ляцелі з Дунаю
Гульлівыя гусі
Ў куток Беларусі;

Ляцелі-ляцелі,
Туды, дзе хацелі
Пажыці-памерці, –
Дзе іхнія сэрцы;

А мне б тыя крылы,
А мне б тыя сілы, –
Ляцеў бы дадому
Не чуючы стому!

Ой, краю, мой краю!
Ляцелі з Дунаю
Вясёлыя гусі
Ў куток Беларусі!..»

Кажа тут анёл адзін:
«Ах! Які высокі гімн!
Слухайце!
Вось жа пяе
Чалавеча на дудзе:
Так іграе, што мая
Ўся галоўка расцвіла!».
Тут музыка не стрываў,
На ўвесь голас заіграў:

«Ох ты, дудка мая,
Залатыя кросны!
Не пачуць салаўя
У Двары дзівосным!

Весялі ж ты мяне
Музыкаю краю;
На чужой старане
Людзі пагібаюць!

І баліць мне мая
Бедная галоўка;
Ой жа, дзе ты, душа, –
Міленькі салоўка?!

Не пачуць мне цябе
Болей ў гэтым свеце;
А анёлчыкі ўсе –
Бы унукі-дзеці!

Дык зайграйма, дуда,
Верная сябрына!
Нешта з намі няма
Ні жаны, ні сына!

Я ад сэрца майго
Пішчыкі настрою;
Залунаем з табой
Ў поле за Гарою!

А ў тым полі вярба,
Ды няма убору;
Бо крынічка-вада
Паплыла да бору!

А у нашай вярбы
Ножанькі баляці;
Без крынічнай вады
Не прысесці-ўстаці!

...Ой ты, дудка мая,
Залатыя кросны!

Хай жа йграе душа
У Двары дзівосным!».
«Вось жа хораша пяе!
Што за музыка ў цябе?» –
Дзівяцца анёлы ўраз.
«Беларуская!» – ў адказ.
Раптам
ключыкі ў замку
Загрымелі пад дуду;
Дзверы – насцеж!
Тут мужык
На хвіліначку прыціх:
У дзвярох стаяў ключар –
Святы Пётра-гаспадар.
«Гэй, Дудар!» – паклікаў ён.
«Што, чаго?» – крыху паклон
Янка звесіў да зямлі...
«Пойдзем!» – загадаў святы.
І удвух, па ўсім дварам,
Рушылі яны у Храм...

А на Небе ўжо пайшла
Пагалоска:
што прыйшла
Беларуская душа,
Бы крынічная сляза;
Й дужа хораша пяе
На вясёленькай дудзе...
Тая хутка навіна

І да Божанькі дайшла.
Святы Бог у гэны час
Раскладаў сабе пас'янс
(У цянёчку той вярбы,
Што засохла да пары).
Выйшаўшы з пакояў,
Ён
Сеў на ганку, бы на трон,
Прахладзіцца спакваля
Ад будзённага жыцця...
Ў небе ж, як і на зямлі:
Хочаш-не, але – рабі;
Можаш вершыкі пісаць,
Ці то, скажам, маляваць;
Ну, а потым – адпачні
У дзянёчак выхадны...
Словам, Янкава душа
У нядзельку падыйшла.

Не паспелі Дудару,
Як належыць – па дабру –
Даць: кватэру, ложак, стол...
Прыляцеў за ім анёл;
Ды не з тых – саўсім малых,
Што лунаді над дзвярмі;
А вялікі, быццам вол,
Ў срэбнай вопратцы анёл!
«Ты – Дудар?» – спытаўся ён.
Янка зноў аддаў паклон:

«Так, паночку: гэта – я...»
«Кажуць, ёсць ў цябе дуда?» –
Задае пытанне госць.
Янку – як у горла косць!
Мусіў дудку паказаць...
«Праўда, што умееш йграць?» –
Зноў пытае пасланец.
«Праўда...» – адазваўся дзед.
Той з цікавасцю глядзіць:
«Можа, нам канцэрт дасі?»...
Янка ўраз павесялеў:
«Ён заўжды да ладу – спеў!
Што ж, чаму не пайграць?
Пець – не бульбу выбіраць!..
Я – гатовы! Перад кім?».
«Перад Божанькам Святым!».
Янка чэша галаву,
З ёй – сівую бараду;
Ды круціў нядоўга вус, –
Ведама, што Беларус:
Нашы людзі з году ў год
Дужа смеленькі народ!

«Добра!» – кажа цвёрда дзед.
«Ну дык пойдзем», – пасланец
Спераду крыху пайшоў;
Янка – ззаду...
А наўкол –
Дзіва-дзіўнае! – Глядзіць,

Не нацешыцца стары...
Ўздоўж дарогі, па садах
Зіхаціць Нябёсны Дах;
Сярод сонейка блішчаць,
Быццам пацеркі гараць,
Залатыя купалы –
Ад касцёла да царквы;
Хаты срэбныя стаяць,
Дзе кладуцца спачываць
Ўсе, хто здолелі ў жыцці
Называць сябе людзьмі...

Тут мужык і пасланец
(Пад дарожанькі канец)
Выйшлі на шырокі пляц.
Пасярод яго – Палац
Бачыць Янка; ды такі,
Што на родненькай зямлі
Не знайсці; а будаваць
І не трэба спрабаваць:
Сцены – чыста з крышталя!
Ад цямна і да святла
Можна бачыць-слухаць, з кім
Размаўляе Бог Святы;
Ні вакон і ні дзвярэй...
Словам, неба – для людзей:
З ранку, ўдзень ці па начы
Што патрэбна, то й бяры...
Як мы помнім, Дудара –

Удалога песняра –
Бог на ганку ўжо чакаў;
Нават неяк ён пачаў
Хваляваўцца за яго –
Бы за хлопчыка свайго...
Тут пяснярская душа
Далікатна падыйшла.

Хоць пражыў мужык сто год,
Зведаў, што такое – пот;
Гонару не разгубіў:
Бо заўсёды сэрцам жыў.
Быў ён мудры чалавек;
Ведаў, перад кім (і дзе)
Захаваць сваё імя, –
Каб запомніла сям'я.

Ад усёй сваёй душы
Пакланіўся да зямлі
Янка – Богу.
Ну а Той
У адказ кіўнуў главой...
А навокал жа, кругом,
У Двары і за Дваром
Надыйшла народу цьма:
Месца – яблыку няма!

Напачатку ў Божы Двор
Прыляцеў анёлаў хор

(Ік сяброўкі над дзвярмі
Янку слухалі ў начы)
Ўсе маленькія, нібы
Дзеткі мілыя з зямлі,
Пачалі яны гуляць,
Кветку-папараць збіраць.
Следам арханёлы ўраз
(Кожны маючы паяс!)
Апусціліся на пляц
(Там, дзе рушыўся Палац)
Быццам крылы журавоў,
Што вяртаюцца дамоў,
Іх адзежы зіхацяць,
Срэбрам-золатам гараць!
І святыя – тут як тут;
А за імі ўсе ідуць:
Дзеці, бабы, мужыкі...
(Праведных – схадзі-злічы!)
Сабралося слухачоў –
Бы у лесе камароў!
Гэта, можа, ад таго,
Што ў нядзельку ўсё было...

Тут убачыў наш пясняр
(Ледзь яго не ўзяў удар!)
Тых, каму ён на зямлі
(Покуль быў яшчэ жывы)
Ставіў свечкі у царкве:
За людзей (і за сябе),

За Радзіму, за любоў –
Дзед убачыў землякоў.

Вылучаўся сярод іх
З кнігай – велічны Францыск;
Ефрасіння побач з ім –
Што бярозанька саўсім;
Быццам хворанькая здань,
Ціхенька Максім стаяў,
Палажыўшы на руку
Васілёчкі у «Вянку»;
Тут і Цётка, і Вінцэнт –
Мілага Францішка цень;
З кніжыцамі у руках
Малады Паўлюк ў лапцях...
Ды хіба злічыць усіх
Беларусаў дарагіх?!
Я, відаць, не памылюсь:
Кожны трэці беларус!

Баранілі ж песняроў
Грудзі вояў-змагароў:
Паабапал грамады –
Нашы вольныя князі!
(Ты, дзіця, запомні іх,
Хоць пералічу не ўсіх)
Ў цэнтры – буйны тур-Віцэнь!
Гэта ён на кожны дзень
Нам аснову залажыў:

Роднай мовай гаварыў
З мілай жонкаю, з дзяцьмі,
Ў хатах – з простымі людзьмі;
Ад яго пячаткі спеў
Да «Пагоні» даляцеў;
І хоць землі не сабраў,
А падмурак – ох! заклаў!

Нарадзіўся – слаўны сын,
Горды віцязь Гедымін!
Першым ён не ваяваў;
Мірным шляхам аб'яднаў
Вёскі, рэчкі ды лясы
(Казкі-песні даўніны).
Быў ён – справядлівы князь;
У ягоны дзіўны час
Людзі пачалі казаць
Між сабою, ды пісаць
Роднай літарай святой...
Хоць і звалася «Літвой»
Беларуская зямля
(Так наспела ад жыцця).
Край наш любы заспяваў!..
Злева Гедымін стаяў.

Правы ж бок трымаў Альгерд,
Помнячы, што мовіў дзед
Мудры чалавек Віцэнь:
«Ад вякоў на кожны дзень

Ні татарам, крыжакам,
Ні палякам, маскалям
Мілых, дарагіх мясцін
Ты, унук, – не аддасі!».
А тады ўжо пачала
Наша рушыцца зямля:
Ад усіх краін-бакоў
Набягала чужакоў
З дзікім полымем вайны...
Ўнук пашырыў – ў два разы
Беларускую Літву! –
На вучобу чужаку...

Ззаду веліч грамады
(Дзе чакаюць больш бяды),
Круцячы сурова вус
Прыкрываў народ Кастусь;
Зіхацеў ў яго руках
Бел–чырвона–белы сцяг!
Гэта ён, дзіцятка, ён
За цябе-мяне памёр
Ў 26 ружовых год!
Бачыць вольным наш народ
Не хацелі маскалі;
І пайшлі на смерць яны:
Загубілі Кастуся
(Хай даруе ім труна)...
Лепей слухай дзіўны сказ:
Бел–чырвона–белы сцяг

К нам прыйшоў з глыбінь вякоў –
Ад прапрадзедаў-дзядоў;
Белы колер – малако,
Матчыных грудзей цяпло;
Знак карміцелькі зямлі,
Нашых сэрцаў чысціні;
Бы крынічная сляза,
Ён – сяброўская рука;
А чырвоны – знак крыві,
Колер праведнай душы,
Што за волю, за зямлю
Ляжа нават у труну...
Ад таго душа – паміж
Дзвюх бялюсенькіх сцяжын;
Нездарма наш край завуць
Белым словам – «Беларусь»...

Гэта ўсё – даўней было;
З часам многае – сплыло;
Сёння кожны, хто хацеў,
Для сябе куток займеў:
Тая ж Латвія, Літва,
(Беларуская зямля!)
Маюць межы ды прастор;
Дзякуй Богу, не памёр
Ні адзін народ святы
Слаўнай некалі «Літвы»!
А чаму? Я раскажу;
Бо стрывацца не магу:

Ў той жа Польшчы за сталом
Наш Ягайла каралём
Засядаў... А пра Літву,
Латвію, –
Я й не кажу!
Беларусаў карані
Маюць нават маскалі!
Ад Альгерда род пайшоў
Многіх рускіх буй-князёў.
Беларусь была ў «Літве»
Бы зярнятка на сяўбе!
Толькі...
Сто гадоў чамусь
Церпялівы беларус
Аддае на здзек сябе:
То кідае, то бярэ
Мову продкаў; а цяпер
Хоча, зрэшты, і надзел
Здаць Расіі...
Можа, ты!
Мне, дзіцятка, раскажы:
За якія ўсе грахі
Нам такія пяруны?!

..............................

Але – добра. Што ж пясняр?
Хоць бы не схапіў удар!
Не-е, жывы...
Стаіць-глядзіць;
Захваціла ў сэрцы дых;

Нават падзабыў дзядок,
Што чакае спеву Бог!
«Ну, здаецца, ўсе прыйшлі. –
Кашлянуўшы, Бог Святы
Першым гутарку пачаў. –
Можа б ты, Дудар, пайграў?».
Ад усёй сваёй душы
Пакланіўся да зямлі
Богу – зноўку мужычок:
«Ах! Вяльможны Пане Бог!
Выбачайце Дудара,
Што спытаю: ці няма
Тут на Небе маладых
Беларусаў; ды з такіх,
Каб вясёлыя былі?»...
«А нашто табе яны?» –
Бог крыху пачухаў лоб.
«Вось жа дзіва! Як «нашто»? –
Кажа дзед ужо смялей. –
Ды пад танцы – йграць лаўчэй!».

Усміхнуўся Бог Святы.
Даў анёлам знак; яны
Паляцелі пашукаць...
Ды вярнуліся назад
Вельмі скора; і адзін
Кажа Богу: «Не знайшлі!
Ўсе – сур'ёзныя яны;
А з вясёлых – ні душы!».

Янка чэша галаву,
З ёй – сівую бараду...
«Не-е, ім час адпачываць;
Не патрапяць станцаваць, –
Разважае ціха дзед. –
Выбачайце зноў мяне,
Што спытаю: а куды ж
Дзелісь душы маладых?
Іншым разам і яны
Паміраюць без пары...»
Падцягнуўшы свой паяс,
Мусіў Янку ў гэты раз
Святы Пётра адказаць:
«Трэба ў Чыстцы іх шукаць».
«А і праўда, – кажа дзед. –
Не іначай – ў Чыстцы ўсе!
На маім былым вяку
Колькі легла у труну
Таго люду; не злічыць
Ўсіх: вясёлых-маладых!
Арцём Лыка (жыў праз двор)
Ад гарэлачкі памёр:
Ох, і цяжкай стала смерць –
Задыхнуўся ува сне;
Мікалаю Гарбузу,
Што як піў, дык на бузу
Ўсё цягнула, –
нейкі жлоб
У карчме раструшчыў лоб;

Анатоля з-пад Карчоў
Ды Антося з Дзяружоў –
На ігрышчах затаўклі:
А танцоры – ух! былі...»

Доўга б вылічаў стары
Ўсіх памёршых без пары;
Але Бог кіўнуў рукой:
«Досыць, Янка; гэта ўсё
Знаем мы...
Ты лепш давай
Нам што-небудзь паспявай!».
Ў дзеда – іскаркі з вачэй:
«Ах! Якую ж песню мне
Вам, Вяльможны Пане Бог,
Паіграць?! Каб толькі мог
Выбіраць я...»
Бог ў адказ:
«Ну-у, вясёлую хацяб...»
З-пад запазухі дуду
Дастае Дудар сваю;
Пішчыкі папрабаваў,
Мех надуў.
І – заіграў:
Так, што зорачак кудзель
Засвяцілася у дзень!
Гукі ластаўкай ляцяць,
Млечным Шляхам зіхацяць;
Быццам вязынскі чабор

Завітаў у Светлы Двор;
І салодзенькі нектар
Ахіліў Нябесны Твар.

Можа добра дзед іграў,
Можа – дрэнна, ён не знаў;
Захваціў ягоны дух
Лебядзінай песні пух, –
Стаўся годзен мужычок,
Каб паслухаў яго Бог!
(То ж не жарты жартаваць, –
Перад Божанькам іграць!):

«А у полі, а у полі
Зазвінелі росы;
Хлопцы тупаюць нагамі,
Дзеўкі круцяць косы.
Гоп-гэй! Зазвінелі росы!
Гоп-гэй! Дзеўкі круцяць косы!

– Ой, ты мілы, мой міленькі,
Сокал даражэнькі!
Сэрца просіцца да шлюбу, –
Стану на каленькі...
Гоп-гэй! Сокал даражэнькі!
Гоп-гэй! Стану на каленькі!

Гэта, можа, і нічога,
Што я – таўставата;

Я не толькі, мой міленькі,
Сцёгнамі багата!
  Гоп-гэй! А я – таўставата!
  Гоп-гэй! Сцёгнамі багата!

Маці віламі напхала
Пышныя падушкі;
Будзе нам з табою свята, –
Загарацца вушкі!
  Гоп-гэй! Пышныя падушкі!
  Гоп-гэй! Загарацца вушкі!

Бацька днюе ды й начуе
Каля свайго млына;
Будзем мы з табой гуляці, –
Пачарнее Зіна!
  Гоп-гэй! Каля свайго млына!
  Гоп-гэй! Пачарнее Зіна!

Ну, хіба я! ну хіба я,
Дзеванька – не душка?!
– Ты ж па вуліцы гуляеш, –
Грамыхае пушка!
  Гоп-гэй! Дзяўчынонька-душка!
  Гоп-гэй! Грамыхае пушка!

Дзеўка ты сабе – хароша;
Ды крывыя лапкі;
Калі просіцца сардэнька, –
Захадзі да хаткі.

Гоп-гэй! Крывенькія лапкі!
Гоп-гэй! Просяцца да хаткі!

Гэта нават і нічога,
Што ты – таўставата;
У зямельцы-чарназёме
Не загразне трактар.
Гоп-гэй! Дзеўка таўставата!
Гоп-гэй! Не загразне трактар!

У мяне на ложку дома
Рваныя падушкі;
Будзе нам «кіно» з табою, –
Закладуцца вушкі.
Гоп-гэй! Рваныя падушкі!
Гоп-гэй! Закладуцца вушкі!

Прыхапі збанок гарэлкі
(Скончыліся віна!)
Станем піць на брудэршафты –
Пачарнее Зіна.
Гоп-гэй! Скончыліся віна!
Гоп-гэй! Пачарнее Зіна!

Ой, ты, дзеванька-былінка,
Я цябе – кахаю!
Ды жаніцца не умею –
Нічога не маю.
Гоп-гэй! Я цябе – кахаю!
Гоп-гэй! Нічога не маю!

...Каля рэчанькі глыбокай
Дзве вярбы старыя;
А у вёсцы каля плота –
Дзеткі маладыя.
Гоп-гэй! Палюбілі дзеткі!
Гоп-гэй! Як у лузе кветкі!».

Вось і кончыў Янка спеў;
Богу ў вочы паглядзеў;
Той ківае галавой:
Задаволен...
«Вой-вой-вой!».
Ад такога шчасця дзед
Ледзьве зноўку не самлеў;
Ціха кропелька слязы
Ахінула твар дуды.

А навокал жа, кругом,
У Двары і за Дваром
Дудару крычаць: «Ура-а!».
Зычаць волі і дабра
Да краёў вялікі мех;
Каб, маўляў, з-за ўсіх уцех
Мілай дудкі не кідаў:
А – спяваў - спяваў - спяваў!..

Тут падняўся з ганку Бог;
Ўраз – перахрысціў натоўп;
Ды накіраваў свой крок

У пакоі... Наш дзядок
Зноўку вытрымаць не змог:
«Ах! Вяльможны Пане Бог!
Самаму няёмка мне
Зноў спытаць...
І ў страшным сне
Вы не думалі, відаць,
Што так будзе дакучаць
Вам пытаннямі зямлі
Нейкі... Дударок стары;
А тым болей (Божа ж мой!)
Ў дзень нядзелечкі святой!
Ох, нягожа мне!...»
«Дудар!
Ты ж, я бачу, – гаспадар! –
Кажа Бог. – Паразважай!
Для каго існуе Рай?»
«Для людзей?» – пытае дзед.
«Ну канешне!
А цяпер
Адкажы:
што Тут рабіць,
Тым, хто мусіў чэсна жыць?»
Янка чэша галаву...
«Ладна, так і быць, – скажу! –
Усміхнуўшысь, Бог Святы
Круціць кончык барады, –
Вам затым і дадзен Рай,

Каб ўсё ведаць.
Ну, пытай!»
Ад усёй сваёй душы
Пакланіўся да зямлі
Янка Богу.
«Вось гляжу
І ніяк я не магу,
Ясны Божа, зразумець
Беларусаў, – кажа дзед. –
Думаў я і так, і сяк –
Не датумкаю ніяк!
Ўсе – вясёлыя вакол!
У маіх жа землякоў
Нейкі сум стаіць ў вачах;
І – маўчаць; усе маўчаць!
Божанька! Што з імі? Што?!
Маладыя ж ёсць...
Няўжо
На зямлі нам лёс – нуда,
А на Небейке – журба?!»
...Цяжка пазірае Бог:
«Ведаеш што, мой дзядок,
Потым я скажу табе;
А пакуль – ідзі сабе...»

Ды пайшоў у свой Палац;
Янка пазірнуў на пляц;
«Што за ліха? Ці я сплю?» –
Нават дзед пра бараду

Мусіў трохі прызабыць
(Праўда, праз хвіліны тры
Ўспомніў,
шчыра пачасаў:
Звычка тых, хто гараваў).
А пабачыў – вось што ён:
У Двары і за Дварам
Цьма народу як была,
Так нікуды й не сышла;
Закрываючы прастор,
Лётае анёлаў хор
Ды збірае пакрысе
Кветкі розныя сабе
(Самы меншанькі за іх,
Бы унучак залаты,
Янку прыпаднёс вянок, –
Ўвесь суцэльны васілёк);
Арханёлаў жа,святых
Не відно
(відаць, сышлі!).
Ды найшло з усіх бакоў
Болей баб і мужыкоў.

Тут анёлаў галасы
(Бы са Слуцку паясы)
Загрымелі на ўвесь свет:
«Ах, як добра йграе дзед!»
«Вось жа хораша пяе!»
«Тру-ля-ляля! Уй-ля-ле!»

«Паіграй ты нам яшчэ
На вясёленькай дудзе!»

А музыка наш і рад;
Грае і пяе, ды так,
Што на небе – там і тут –
Раздаецца: «Ўвэры гут!»
«Вуаля э кі трэ б'ён!»
«Фэй чан хаў ды!». «Грацыо!»
«Ладна п'ясенка!» . «Зэр шон!»[1]...
Ну і рускае: «Ого!».

«Гоп-гэй! Тру-ля-ля!
Зазвіні мая дуда!
Каб лунала сярод зор,
Быццам я й не памёр!

Гоп-гэй! Тру-ля-ля!
Зазвіні мая дуда!
Каб пачулі гэты спеў,
Хто ў Радзіме не згавеў!»

Слухаць – слухалі яны
Песні Янкавай дуды;
Ды не здолелі маўчаць –
Самі пачалі спяваць:
Ціха – ўраз, пасля – ямчэй

---

[1] «Вельмі добра! Добрая песня!» – па-ангельску, па-французску, па-кітайску, па-італьянску, па-польску, па-нямецку..

(Словам, ўсё як у людзей!)
Ну а там (куды ж стрываць?!)
З мужыком пайшлі скакаць:
Прытанцоўвае нагой
Нейкі дзядзька з барадой;
Бабы – качкамі плывуць;
Хлопцы ў прысядкі ідуць;
Быццам ластаўкі вясной,
Дзеўкі кружаць чарадой...
І усе – пяюць, пяюць!
У далонькі жвава б'юць:

«Зянон Пазьняк ні ў чым не вінаваты.
Плявузганне хлусоў – не аргумент.
Ён вернецца: да родных ніў, да хаты
Наш бел-чырвона-белы Прэзідэнт!

Яго электарат не спіць у шапку;
А лічыць дні, калі з-пад чорных дзір
Абрынецца з расчыненага «Шатлу»
Наш бел-чырвона-белы Павадыр!

На беларускіх прэрыях – кансенсус;
Рахманых цёлак не цікуе звер.
Вось-вось, здаецца, высунецца з лесу
Наш бел-чырвона-белы Піянер!

– Вяртайма нашы гарады і сёлы!
З-пад маскалёў вяртайма нашых баб!..
Пад свае шаты ўсіх склікае сёння
Наш бел-чырвона-белы Баабаб!..

Зянон Пазьняк ні ў чым не вінаваты.
Плявузганне хлусоў – на іх імпэт.
Ён вернецца: да родных ніў, да хаты
Наш бел-чырвона-белы Аргумент![1].

Гоп-гэй! Тру-ля-ля!
Зазвіні мая дуда!
Каб паслухалі мяне,
Хто ў Амерыцы жыве!

Гоп-гэй! Тру-ля-ля!
Зазвіні мая дуда!
Каб пачулі гэты спеў,
Хто ў Штатах не згавеў!»

Міма йшоў святы Язэп:
«Што за дзіва? Нейкі дзед
На услон прысеў з дудой
І – пяе...
Пчаліны рой
Бабскіх і мужчынскіх душ
(Быццам белы капялюш)
Хорам ля яго вісіць –
Песні свецкія грыміць!».

«Маці Боска! – крыкнуў ён. –
То ж павінен арханёл
Гаўрыіл усё рабіць:
Песням – Неба іх вучыць!»

---

[1] Песня на верш сябра «Жыве Зянон!».

Ды пабег, як толькі мог,
Да святога Пётры ў лог;
А туды прыйшоў якраз
Арханёл Гаўрыла ўраз;
Да пачаў (як той Язэп)
Пётру жаліцца паэт:
«Так і так; відаць, памру;
Сэрца рвецца ў бараду!
Замест песенек Царквы
Ўсе спяваюць ад душы
Беларускую дуду, –
Янка вучыць... Не магу!»

Пётра выйшаў на парог:
А і праўдачка; дальбог!
Па ўсім Небе, там і тут,
Песні белыя гудуць.
«Гэта – нельга дазваляць!
Ці не клікнуць Дудара?» –
У Гаўрылы запытаў.
«Можна», –
Той ледзь адказаў.

Дзед – ідзе! Яго дуда,
Бы чароўная вясна,
З-пад запазухі тырчыць:
Ціха ў вочанькі глядзіць.
Ад усёй сваёй душы
Пакланіўся да зямлі

Янка дарагім святым:
«Вось і я! Ці звалі вы?»
Пётра мужыку ў адказ:
«Выйшаў казус тут у нас;
Можа б ты пайшоў куды?»
«З Неба?» – дзівіцца стары.
«Ну вядома!» – кажа той.
Янка круціць галавой:
«А куды ж Адсюль ісці?»
«Вось і я аб тым – куды?!» –
Святы Пётра моршчыць лоб.
Янка запытаў ізноў:
«Чаму ж хочаце вы так,
Каб я кінуў гэты Дах, –
Веліч Боскую Мясцін?
Я ж нічога не зрабіў
Тут благога: не украў,
Не пакрыўдзіў... Я – спяваў».
Святы Пётра у адказ:
«Эх! Ды зразумей ты нас!
Справа, братачка, у тым,
Што на Небе пачалі
Песні свецкія спяваць;
Гэта ж нельга дазваляць:
Вывучаць павінны вы
Толькі музыку Царквы!..
Можа, кінеш ты дуду?»
«Не-е, паночку, не магу.
Лепей я, – смяецца дзед, –

Ўжо Адсюль пайду сабе!»
«З Раю, дзядзька, – насаўсім?» –
Здзіўлена спытаў святы.
Янка усміхнуўся ў вус:
«Я ж – дасужы: Беларус!».

«Э-э-э, браточка, што там – Рай!
Ты мяне ўжо выбачай. –
Кажа весела дзядок. –
Я знайду сабе куток!»
«Там, адкуль Сюды прыйшоў? –
Пётра не знаходзіць слоў. –
Ў Вязынцы?». «А то куды ж
Мне ісці?! – Сказаў стары. –
Ў мілай, роднай старане
Хіба страшна будзе мне?!
Беларусь – не Неба! Там
Без жалейкі нельга нам!
Косяць сена мужыкі,
Бабы – згрэбаюць ў стажкі, –
Працы – вышай галавы:
Як жа нам ды без дуды?!
На рабоце ўсім людзям
З песняй гора папалам;
Пабрыду я са сваёй
Мілай дудкаю-дудой
Па лясох ды па палёх;
Ля скацінкі – пастушок
Будзе ціхенька сядзець, –

На жалейцы песні пець:
Я нячутна падыйду
Ды зайграю, падпяю
Па-над вушкам пастушка;
Дзеўка-дзеванька вясна
Над бялеючым руччом
Засмуціцца ў шлюбны дом;
Навучу й яе спяваць,
Сярод зорачак лунаць...
(Хай жа ў мілай старане
Не зміраюць ува сне
Песні родненькай зямлі,
Нашы казкі даўніны)...
З тапарамі ў ціхі лес
Пойдуць мужыкі сабе:
Прытаюся за сасной
І зайграю я дудой;
Каб спарней ішла у іх
Праца (любых, дарагіх!)
А калі і не знайду
Я людзей; вазьму-пайду
Ў цёмны шапатлівы бор,
Дзе бульчыць зара да зор
Перазвонамі ў руччу:
Ды і ім я падпяю;
Падыграю ад душы –
Быццам я саўсім жывы...
Цяжка ў роднай старане;
Ды і добра ў ёй!..

Мяне
Ты ўжо, Пётра, выбачай, –
Не прываблівае Рай!
Калі быў яшчэ жывы,
Бога я прасіў-маліў,
Каб дазволіў мне спяваць
(Пасля смерці – спачываць)
Ў роднай велічы абшар;
Я ж сабе і пан, і цар, –
Толькі траплю ў сіні бор;
Мілы вязынскі чабор
Не змяняю я, дальбог,
Ні на які Рай-Куток!»

«Ну то добра. Калі так,
Йдзі сабе ты, Ян Дудар,
З Богам ў родную зямлю. –
Кажа Пётра мужыку. –
А то песнямі дуды
Папсуеш нам Неба ты!..
Толькі, дзядзька, не крыўдуй!»
«Ды якая крыўда тут?! –
Кажа весела дзядок. –
Але як там Пане Бог?
Развітацца б я хацеў...»
Пётра ціха мовіць: «Не-е;
Лепш не трэба.
Святы Бог
Засмуціцца». «А чаго?» –

Янка чэша бараду.
«Ладна. Так і быць, скажу! –
Пётра паглядзеў вакол: –
Помніш, бачыў землякоў?»
«Помню, – адазваўся дзед. –
Сумныя; маўчаць усе...»
«Ну дык вось, – пачаў святы, –
Божанька наш Дарагі
Беларусаў адпусціў
На зямлю, да родных ніў».
«А чаму?» – спытаў стары.
«Каб не паўміралі вы», –
Кажа Пётра. «Хто ж стаяў
Там на пляцы?» – дзед спытаў.
«Быццам белы капялюш,
Там лукалі – здані душ!»
Янка здзіўлена глядзіць:
«Значыць, знае Бог Святы,
Што я з Небейка іду?»
«Знае, Янка; і таму
Засмуціцца Святы Бог;
Бо вясёлы ж ты, дальбог! –
Пётра ўсміхнуўся:
– Мне
Тут мільгнула ў галаве
Думка добрая адна:
Можа, хай твая душа
Пасяліцца на якой
Зорцы-знічцы залатой?

Выбірай любую!»
Дзед
Кажа: «Ды навошта мне
Зорка?! Лепей я пайду
Ў дарагую старану, –
Ў Вязынку!». Святы ў адказ:
«Ну, бывай! Ды помні нас...»

Ад усёй сваёй душы
Пакланіўся да зямлі
Мужычок свайму Пятру;
Той падаў яму руку...
Янка выйшаў з Брамы ў Рай;
Ў свеце ночка ўжо была;
Дзед жа ў вопратцы адной
Ды не холадна з дудой
Ў родненькі куток ісці!
Паагледзеўся стары;
Бачыць: ластаўкай уніз
Сцежка зоркамі ляціць...
«Ой, ты, волечка мая! –
Загула яго душа. –
Гоп-гэй! Тру-ля-ля!
Зазвіні мая дуда!
Каб лунала сярод зор, –
Быццам я і не памёр!

Гоп-гэй! Тру-ля-ля!
Зазвіні мая дуда!

Каб пачулі гэты спеў,
Хто ў Радзіме не згавеў!»
К лесу падыйшоў стары
Ды схаваўся ў гушчары...

Можа, праўда; можа, сон;
Ў сінім небе з даўніх дзён
Ясны месячык пяе,
Што аднойчы – па вясне –
Зазвінелі па зямлі
Песні Янкавай дуды;
Быццам сіні васілёк
Кожны заквітнеў куток...

Сакавік–красавік 2000 года.

**Тарас Касмінка**
**(Аляксандр Анатольевіч Мяснікоў)**

**«Казка пра Бога Святога і Дудара удалога»**
**(паводле казкі Вацлава Ластоўскага «Дудар»)**

**Падпісана да друку 21.07.2000 г.**
**Фармат 70*100 1/32. Папера афсэтная.**
**Гарнітура Times. Друк афсэтны.**
**Наклад 100 ас.**

